**Гавяйновіч, В.** Белая чайка над возерам Белым / В. Гавяйновіч // Полацкі веснік. – 2011. – 5 ліп. – С. 7.

# БЕЛАЯ ЧАЙКА НАД ВОЗЕРАМ БЕЛЫМ

Назва народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Белая чайка» нарадзілася невыпадкова. Адно з чысцюткіх азёр на тэрыторыі Полаччыны – Белае – знаходзіцца тут, у Азіна. Раней і сама вёска мела такую назву.

У 1991 годзе быў заснаваны народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Белая чайка» пры Азінскім сельскім доме культуры. Цікавыя сцэнічныя вобразы, якія стваралі самадзейныя артысты, праз два гады прынеслі ім славу, і калектыву было прысвоена званне «народны». У 1996 годзе ансамбль прадстаўляў Віцебскую вобласць на першым рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Дажынкі» ў г. Століне Брэсцкай вобласці. У 1999 годзе ансамбль стаў лаўрэатам конкурсу «Звіняць цымбалы і гармонік», які праходзіць у г. Паставы. З поспехам гэты творчы калектыў выступаў на канцэртных пляцоўках фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2002» у Полацку. Мастацкім кіраўніком ансамбля з 1998 года з'яўляецца самадзейны кампазітар Віктар Малых. Віктарам Леанідавічам напісана нямала песень. Яго найгрышы выконвае знакаміты ў нашай краіне аркестр імя Жыновіча, а пяць песень спявае вядомы ў Беларусі хор пад кіраўніцтвам Міхася Дрынеўскага. У 2004 годзе песня, напісаная Віктарам Малых на словы полацкай паэткі Надзеі Ярмак «Стою у березы», прысвечаная 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, заняла першае месца на абласным конкурсе самадзейных артыстаў. У гэтым жа годзе ансамбль прыняў удзел у Рэспубліканскім фестывалі «Беларусь – мая песня», пацвердзіўшы званне «народны».

У саставе ансамбля дзесяць самадзейных артыстаў. Таіса і Вячаслаў Мурашкевічы, Святлана Цішаловіч, Аксана Валынка, Людміла Петрашкевіч, Віктар Малых стаялі ля вытокаў стварэння гэтага творчага калектыву. У ансамблі выступаюць і Кіра Валынка (яна з дзяцінства прыходзіла на рэпетыцыі яшчэ з мамай), Вольга Кірпічонак, Вольга Холад, Зоя Чарнышова.

У 2007 годзе калектыў прыняў удзел у абласным конкурсе «Іграй, гармонік!», дзе стаў лаўрэатам. Неаднаразова ансамбль прымаў удзел у раённых і гарадскіх мерапрыемствах, паспяхова выступаў на свяце, прысвечаным Дню нараджэння горада Полацка, раённым свяце, прысвечаным Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Сёлета творчым калектывам дадзена ўжо 12 канцэртных выступленняў. Рэпертуар ансамбля папоўніўся новымі творамі, сярод якіх «Ой, зіма-зіма», «Як за гарой», «Трын трава», «Кадрыля». У рэпертуары ансамбля больш за 30 харавых і танцавальных нумароў.

Калектыў ансамбля – людзі з адкрытай і творчай душой. Гэта адзіная сям'я, якая разам праводзіць не толькі традыцыйныя рэпетыцыі, але сустракаюцца і ў вольны час, адзначаюць дні нараджэння, разам адпачываюць на прыродзе. Удзельнікі ансамбля ў час нашай размовы гаварылі, што для іх «Белая чайка» – пласт жыцця, адпачынак і творчая работа.

За прапаганду беларускай народнай песні ансамбль неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі, дыпломамі раённых, абласных, рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў.

На сваё 20-годдзе творчы калектыў «Белай чайкі» выступіў з канцэртам перад аднавяскоўцамі: ярка, з настроем выконвалі яны папулярныя сярод гледачоў музычныя творы. А падарункам для артыстаў была цеплыня сэрцаў, шчырыя ўсмешкі, гарачыя апладысменты тутэйшых жыхароў.

***Вольга Гавяйновіч.***